Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры
і сучаснага мастацтва

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«___» ___________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___/ баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАНАННІ ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Н. Я. Шалупенка,* дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі;
*П. А. Гуд,* прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар;
*Н. У. Карчэўская,* дацэнт кафедры харэаграфіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*А. А. Гулак,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;
*І. А. Алексніна,* дацэнт кафедры тэатральнай творчасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*Л. У. Дамнянкова,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*В. П. Пракапцова*, загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
*У. А. Мішчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», прафесар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*саветам* факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 27.10.2014 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 13.11.2014 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. Я. Шалупенка

# ЗМЕСТ

Уступ ……………………………………………………...…. 4

Дыпломная работа: агульныя палажэнні …………………. 5

Структура і змест дыпломнай работы ……………………. 7

Падрыхтоўка практычнай часткі дыпломнай работы …… 15

Патрабаванні да афармлення дыпломнай работы ……...… 18

Абарона дыпломнай работы ………………………..……. 20

Дадаткі ……………………………………………………… 22

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Дыпломная работа з’яўляецца кваліфікацыйнай работай, якая пішацца студэнтамі на апошнім курсе навучання ў БДУКМ і з’яўляецца завяршаючай стадыяй вучэбнага працэсу і неабходнай умовай атрымання вышэйшай адукацыі. Дыпломная работа – не толькі заключны этап студэнцкай падрыхтоўкі, але і творчая справаздача выпускніка факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Пры выкананні дыпломнай работы ад выпускніка патрабуецца творчы падыход, уменне паспяхова выкарыстоўваць атрыманыя за час вучобы ва ўніверсітэце веды.

Мэта дыпломнай работы – паказаць адпаведнасць узроўню падрыхтоўкі выпускніка, яго ведаў і навыкаў (кампетэнцый), атрыманых у працэсе навучання, патрабаванням адукацыйнага стандарту і кваліфікацыйным характарыстыкам спецыяліста.

Неабходнасць распрацоўкі метадычных рэкамендацый абумоўлена тым, што студэнты і навуковыя кіраўнікі сутыкаюцца з адсутнасцю адзіных патрабаванняў да выканання дыпломных работ. Гэта прыводзіць да шэрагу тыповых недахопаў і памылак у дыпломных работах.

Прадстаўленыя метадычныя рэкамендацыі складзены з улікам спецыфікі падрыхтоўкі спецыялістаў на кафедрах факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва і асноўных патрабаванняў да дыпломных работ, прадугледжаных нарматыўнымі дакументамі.

У метадычныя рэкамендацыі ўключаны дадаткі – узоры дакументаў, неабходных для правільнага афармлення дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дыпломная работа: агульныя палажэнні

Дыпломная работа – вынік асабістай навукова-творчай і практычнай дзейнасці выпускнікоў факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, якая распрацоўваецца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі студэнтаў па пэўнай спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці).

*Спецыяльнасць «рэжысура свят».* Дыпломная работа ўключае: пастаноўку дыпломнага свята і напісанне тэарэтычнай часткі дыпломнай работы (навукова-тэарэтычнае даследаванне па тэме свята і рэжысёрскі праект свята).

*Спецыяльнасць «харэаграфічнае мастацтва».* Дыпломная работа можа быць як *тэарэтыка-мастацтвазнаўчай*, так і *тэарэтыка-практычнай* (балетмайстарская эксплікацыя). У першым выпадку студэнт распрацоўвае актуальную і недаследаваную (мала даследаваную) у сучасным мастацтвазнаўстве тэарэтычную праблему па гісторыі, тэорыі беларускага або замежнага харэаграфічнага мастацтва і вырашае яе ў межах сваёй дыпломнай работы. У іншым выпадку студэнт павінен паставіць харэаграфічны нумар, а ў тэкставай частцы работы (балетмайстарская эксплікацыя) апісаць працэс фарміравання балетмайстарскай задумы і яе практычнае ўвасабленне на сцэне.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (тэатральная)».* Дыпломная работа ўключае: пастаноўку дыпломнага спектакля і напісанне тэарэтычнай часткі дыпломнай работы (рэжысёрскі пастановачны план або эксплікацыя спектакля паводле абранай п’есы (інсцэніроўкі).

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (народныя рамёствы)»; спецыяльнасць «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамак спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)».* Дыпломная работа складаецца з наступных частак: самастойны мастацкі твор у абраным відзе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, графічны праект, які адлюстроўвае канцэпцыю мастацка-вобразнай ідэі твора, і тэарэтычная частка ў выглядзе тлумачальнай запіскі.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», спецыялізацыя «этна-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*фоназнаўства».* Дыпломная работа ўключае: мастацкую рэканструкцыю традыцыйнага абраду (ці яго асобнага этапу) і напісанне тэарэтычнай часткі дыпломнай работы.

Тэматыка дыпломных работ павінна быць актуальнай для сучаснай сацыякультурнай практыкі і перспектыўнай для далейшай яе распрацоўкі, арыентаванай на прафесійную дзейнасць.

Тэматыка дыпломных работ распрацоўваецца кафедрай і даводзіцца да ведама студэнтаў. Студэнтам прадастаўляецца права выбару тэмы дыпломнай работы. Студэнт можа прапанаваць сваю тэму дыпломнай работы. У гэтым выпадку ён павінен звярнуцца да загадчыка кафедры з пісьмовай заявай, у якой абгрунтоўваецца мэтазгоднасць яе распрацоўкі.

Тэмы дыпломных работ зацвярджаюцца загадам рэктара. У выпадку неабходнасці змянення або ўдакладнення тэмы дыпломнай работы дэкан факультэта на падставе прадстаўлення кафедры хадайнічае аб унясенні адпаведных змяненняў у загад рэктара.

Кіраўнікі дыпломных работ вызначаюцца кафедрай і зацвярджаюцца загадам рэктара. Кіраўнікамі дыпломных работ прызначаюцца асобы з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта, пераважна прафесары і дацэнты, а таксама навуковыя работнікі і высокакваліфікаваныя спецыялісты адпаведнага профілю.

Кіраўнік дыпломнай работы:

– выдае заданне на дыпломную работу (Дадатак А);

– рэкамендуе неабходную асноўную літаратуру, даведачны матэрыял і іншыя крыніцы па тэме;

– дае кансультацыі і кантралюе ход выканання работы да моманту абароны;

– складае водзыў на дыпломную работу.

У выпадку неабходнасці і па ўзгадненні з кіраўніком дыпломнай работы кафедра можа запрашаць кансультантаў па асобных раздзелах дыпломнай работы. Кансультанты правяраюць адпаведны раздзел дыпломнай работы і ставяць на тытульным лісце свой подпіс.

За выкананне дыпломнай работы і прынятыя ў ёй рашэнні, правільнасць усіх даных і зробленыя вывады адказвае студэнт – аўтар дыпломнай работы. Студэнт прадстаўляе кіраўніку завершаную дыпломную работу. Кіраўнік складае на яе водзыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыпломная работа з водзывам кіраўніка не пазней чым за два тыдні да абароны прадстаўляецца загадчыку кафедры, які вырашае пытанне аб магчымасці допуску студэнта да абароны дыпломнай работы. Для вызначэння магчымасці допуску студэнта да абароны дыпломнай работы на кафедры можа ствараецца рабочая камісія.

Калі загадчык кафедры або рабочая камісія ўстанавілі неадпаведнасць дыпломнай работы заданню і патрабаванням, пытанне аб допуску студэнта да абароны дыпломнай работы разглядаецца на пасяджэнні кафедры з удзелам кіраўніка дыпломнай работы.

Допуск студэнта да абароны дыпломнай работы фіксуецца подпісам загадчыка кафедры на тытульным лісце дыпломнай работы.

Дыпломныя работы, якія дапушчаны кафедрай да абароны, накіроўваюцца загадчыкам кафедры на рэцэнзію. Рэцэнзенты дыпломных работ зацвярджаюцца дэканам факультэта па прадстаўленні загадчыка кафедры не пазней чым за адзін месяц да абароны дыпломнай работы.

У якасці рэцэнзентаў могуць выступаць асобы з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу іншых кафедр універсітэта і іншых установ вышэйшай адукацыі, спецыялісты арганізацый і ўстаноў сацыякультурнай сферы, супрацоўнікі навуковых установ.

Студэнт павінен быць азнаёмлены з рэцэнзіяй не пазней чым за дзень да абароны.

Дыпломная работа, заданне на дыпломную работу, водзыў і рэцэнзія прадстаўляюцца ў дзяржаўную экзаменацыйную камісію.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Структура і змест дыпломнай работы

Структура дыпломнай работы павінна адпавядаць сучасным патрабаванням да напісання навуковага даследавання і ўключаць абавязковыя часткі:

– тытульны ліст;
– рэферат;
– змест;
– уводзіны;

– асноўная частка, якая ўключае главы, раздзелы і падраздзелы;
– заключэнне;
– бібліяграфічны спіс;
– дадаткі (пры неабходнасці).

**Тытульны ліст** – першая старонка работы (нумар старонкі не прастаўляецца). На тытульным лісце павінны быць указаны: ведамасная прыналежнасць установы адукацыі; назва ўстановы адукацыі, факультэта і кафедры, на якой выканана работа; тып работы (дыпломная); тэма работы; звесткі аб аўтары (курс, група, прозвішча, імя, імя па бацьку студэнта); звесткі аб навуковым кіраўніку (вучоная ступень, званне і пасада, прозвішча, імя, імя па бацьку); дата допуску да абароны і подпіс загадчыка кафедры; месца і год прадстаўлення работы да абароны (Дадатак Б).

**Рэферат –** другая (пасля тытульнага ліста) старонка дыпломнай работы, якая, як і наступныя старонкі, нумаруецца. У рэфераце прадстаўлены: аб'ект даследавання, мэта дыпломнай работы, метадалогія і метады даследавання, асноўныя вынікі дыпломнай работы, іх навуковае або практычнае значэнне, а таксама даныя аб дадатках. Пачынаецца рэферат з ключавых слоў, затым прыводзіцца сам тэкст. Ключавыя словы пішуцца вялікімі літарамі, аддзяляюцца адно ад другога коскай. Аб'ём рэферата – адна старонка.

**Змест** – уключае назвы глаў, раздзелаў і падраздзелаў з указаннем нумароў старонак, на якіх пачынаюцца матэрыялы адпаведных частак работы (Дадатак В).

**Уводзіны –** уступная частка дыпломнай работы. Ва ўводзінах абгрунтоўваецца выбар тэмы і яе актуальнасць, фармулююцца мэта і задачы дыпломнай работы, аб'ект і прадмет даследавання, указваецца ступень распрацаванасці праблемы, навізна і практычная значнасць дыпломнай работы, метадалогія і метады даследавання, структура дыпломнай работы.

**Асноўная частка** – уяўляе сабой тэарэтыка-практычную аснову работы. Змест асноўнай часткі вызначаецца ў адпаведнасці са спецыфікай падрыхтоўкі спецыялістаў па канкрэтнай спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці).

*Спецыяльнасць «рэжысура свят».* Асноўная частка дыпломнай работы складаецца, як правіла, з дзвюх глаў, якія ў сваю чаргу маюць не менш двух раздзелаў. Першая глава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з’яўляецца навукова-тэарэтычным даследаваннем, якое раскрывае тэндэнцыі развіцця свята на розных гістарычных этапах. У гэтай главе неабходна разгледзець:

– на аснове вывучэння гістарычных, архіўных і фальклорных крыніц агульнанацыянальныя традыцыі, тэрытарыяльныя і мясцовыя асаблівасці правядзення свята;

– традыцыйную кампазіцыйную пабудову свята;

– сімволіку і семантыку абрадава-рытуальных і гульнявых дзей;

– традыцыйныя формы стварэння перадсвяточнай і святочнай атмасферы;

– традыцыйны парадак правядзення абрадава-рытуальных і гульнявых дзей;

– сучасны стан свята;

– дзейнасць устаноў культуры і мастацтва па адраджэнні, захаванні і развіцці народных традыцый у сучаснай святочнай культуры Беларусі, творчым пераасэнсаванні і стварэнні на аснове мастацкіх здабыткаў мінулых пакаленняў новых святочных формаўтварэнняў, пазітыўныя і негатыўныя тэндэнцыі ў гэтым працэсе.

Другая глава – рэжысёрскі праект свята, які ўключае: задуму, творчую распрацоўку і ўвасабленне святочных дзей абранага студэнтам свята, а таксама вырашэнне матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і фінансавых аспектаў. У структуру рэжысёрскага праекта ўваходзяць:

– задума свята: творчая заяўка на правядзенне свята; форма правядзення свята (рэканструкцыя, рэстаўрацыя, новае святочнае формаўтварэнне); навізна свята; арганізацыі, зацікаўленыя ў правядзенні свята; месца правядзення свята, яго архітэктурна-ландшафтныя асаблівасці; адрас свята (узрост, сацыяльны статус людзей); праграма свята; арганізацыя перадсвяточнай атмасферы;

– сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка свята: тэма свята, ідэя – звышзадача; разгорнуты сцэнарны план з указаннем эпізодаў свята (вобразная назва эпізоду, структура, рэжысёрскі акцэнт); кампазіцыйная пабудова; сцэнарна-рэжысёрскі ход; мастацкі вобраз свята;

– арганізацыйна-вытворчы план падрыхтоўкі свята: аргкамітэт свята; палажэнне аб правядзенні свята і журы (у выпадку конкурснай асновы свята); арганізацыйна-вытворчы аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнарыя (творчае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне); наяўнасць прызавога фонду; арганізацыя прыёму гасцей; работа з дапаможнымі службамі (пажарная, медыцынская службы; служба бяспекі дарожнага руху; служба аховы);

– літаратурны сцэнарый свята;

– каштарыс свята.

*Спецыяльнасць «харэаграфічнае мастацтва».* У асноўнай частцы *тэарэтыка-мастацтвазнаўчай* дыпломнай работы студэнт павінен:

– правесці аналітычны агляд навукова-крытычных, архіўных, мемуарных, электронных крыніц;

– прадставіць гістарычны аналіз вывучаемай праблемы; выявіць кірункі і заканамернасці ў развіцці таго ці іншага напрамку, стылю, жанру харэаграфічнага мастацтва;

– выявіць агульныя і спецыфічныя рысы ў творчасці тых ці іншых балетмайстраў, выканаўцаў;

– абагульніць і сістэматызаваць па пэўным прынцыпе (хроналагічным, сістэмна-аналітычным) сабраны матэрыял.

У асноўнай частцы *тэарэтыка-практычнай* дыпломнай работы студэнт павінен:

– вызначыць стылявую і жанравую скіраванасць асабістага харэаграфічнага твора;

– правесці гістарычны аналіз балетмайстарскіх прац, якія належаць да аналагічнага стылю і жанру, што абраны для дыпломнай работы;

– апісаць працэс фарміравання мастацкай задумы будучага твора;

– ажыццявіць аналіз музычнага матэрыялу, абранага для харэаграфічнага ўвасаблення (пры магчымасці прааналізаваць творчасць кампазітара ці музыкальнай групы);

– скласці падрабязны кампазіцыйны план;

– распрацаваць канцэпцыю дэкарацыйнага і светлавога вырашэння харэаграфічнага твора, а таксама сцэнічных касцюмаў для выканаўцаў;

– абгрунтаваць прынцыпы адбору выканаўцаў;

– распрацаваць графік пастановачнай і рэпетыцыйнай работы;

– апісаць выразныя сродкі, балетмайстарскія прыёмы, якія выкарыстоўваліся ў харэаграфічным творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (тэатральная)».* У асноўнай частцы дыпломнай работы, якая складаецца з 4 глаў, асвятляюцца галоўныя пытанні пастановачнага плана. Першая глава прысвечана даследаванню аб аўтары, другая – рэжысёрскаму аналізу п’есы, трэцяя – апісанню рэжысёрскай задумы спектакля, чацвёртая – апісанню працэсу сцэнічнага ўвасаблення спектакля.

У першай главе дыпломнай работы раскрываюцца асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху аўтара, даецца кароткі аналіз творчасці драматурга (пісьменніка, паэта), вызначаюцца літаратурна-мастацкія і стылістычныя асаблівасці яго творчасці, асноўная тэма творчасці драматурга (пісьменніка, паэта), роля і месца дадзенага твора ў творчасці драматурга (пісьменніка, паэта), стылістычныя і моўныя асаблівасці абранага твора (п’есы, апавядання, аповесці, верша), раскрываецца гісторыя пастановак абранага твора.

У другой главе апісваюцца першыя ўражанні аб творы, вызначаюцца яго асноўная тэма і ідэя, сюжэт і фабула, жанр і стыль, прапанаваныя абставіны, скразное і контрскразное дзеянні ў творы, іх носьбіты, асноўны і другарадныя канфлікты ў творы, іх носьбіты, кампазіцыйная пабудова п’есы (апавядання, аповесці, верша), асноўныя аўтарскія рэмаркі ў творы, характарыстыка дзеючых асоб, дадзеная аўтарам твора.

Трэцяя глава дыпломнай работы прысвечана апісанню рэжысёрскай задумы (экспплікацыі) спектакля, вызначэнню яго тэмы, ідэі і звышзадачы, жанру і стылю, прапанаваных абставін, кампазіцыйнай пабудовы спектакля, падзейнага рада спектакля і яго ключавых мізансцэн, характарыстык дзеючых асоб, прынцыпаў сцэнаграфічна-дэкарацыйнага і музычна-шумавога вырашэння.

Чацвёртая глава прысвечана ўвасабленню рэжысёрскай задумы дыпломнага спектакля на сцэнічнай пляцоўцы: даецца апісанне сцэнаграфічнага, музычна-шумавога, светлавога і пластыка-харэаграфічнага вырашэння спектакля, яго атмасфера і інш.

Асноўныя пытанні для работы над рэжысёрскім пастановачным планам прыведзены ў Дадатку Г.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (народныя рамёствы)»; спецыяль-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*насць «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамак спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)».* У асноўнай частцы дыпломнай работы прадстаўляецца значны аналітычны матэрыял па абранай тэме. Інфармацыйнае напаўненне асноўнай часткі, колькасць глаў і раздзелаў варыятыўна і залежыць ад мэты і задач даследавання. Тэарэтычна значным з'яўляецца гістарычны агляд развіцця пэўнага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аналіз яго сучаснага стану, персаналіі мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, разгляд асаблівасцей іх творчых пошукаў.

Асобная глава ўключае матэрыял, які з'яўляецца падмуркам мастацкай ідэі твора і прадстаўляе апісанне народных свят і абрадаў, міфапаэтычных уяўленняў беларусаў, гістарычных і культурных падзей і г. д. Таксама аналізуюцца творы мастакоў, блізкія да абранай студэнтам тэматыкі, іх мастацка-вобразнае і кампазіцыйнае рашэнне, тэхналагічныя асаблівасці.

Абавязковай з'яўляецца глава, у якой раскрываецца методыка стварэння мастацкага твора. У раздзелах абгрунтоўваецца пластычны вобраз твора, кампазіцыйная схема, выразныя сродкі (графічныя, пластычныя, каларыстычныя, дэкаратыўныя). Падрабязна даецца апісанне паслядоўнасці выканання аўтарскага твора; выкарыстаных матэрыялаў, абсталявання і інструментаў.

Асноўная частка дыпломнай работы выпускнікоў напрамку спецыяльнасці *«дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)»* абавязкова ўключае тэарэтычны раздзел па методыцы рэстаўрацыі вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У асобным раздзеле апісваецца паслядоўнасць выканання студэнтам кансервацыйных або рэстаўрацыйных работ на канкрэтным творы.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», спецыялізацыя «этнафоназнаўства».* Асноўная частка дыпломнай работы складаецца з дзвюх (трох) глаў, у якіх разглядаюцца тэарэтычны і практычны аспекты дыпломнай работы.

Першая глава – аналітычная частка, якая адлюстроўвае тэарэтычную базу дыпломнага праекта. У ёй адзначаюцца асноўныя канцэптуальныя здабыткі беларускай фалькларыстыкі па тэме даследавання і даецца апісанне навуковых высноў, зробленых аўтарам у ходзе падрыхтоўкі дыпломнай работы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– указваюцца працы айчынных і замежных даследчыкаў, дзе выкладзены асноўныя навуковыя палажэнні адносна аб’екта даследавання: лакалізацыя, храналогія, міфасемантыка і структура абраду (ці яго асобнага этапу), удзельнікі і жанравы склад абрадавых твораў;

– акрэсліваецца зона (ці зоны) найбольшага пашырэння абраду, дзе захаваліся носьбіты і пераймальнікі традыцыі; робіцца вывад аб прыналежнасці аб’екта даследавання да пэўнага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі;

– вызначаецца ступень захаванасці абранай для мастацкай рэканструкцыі абрадавай з’явы ў сучаснай сацыякультурнай прасторы, ацэньваюцца ўмовы для яе вывучэння і пераймання і магчымасць яе рэвіталізацыі;

– указваюцца артэфакты народнай культурнай спадчыны, якія з’яўляюцца актуальнымі менавіта пры мастацкай рэканструкцыі абраду (ці яго асобнага этапу) у сучаснай сацыякультурнай прасторы.

Другая глава – праектная частка дыпломнай работы. Змест яе засноўваецца на аўтэнтычным фальклорным матэрыяле. У ёй апісваецца аўтарская методыка мастацкай рэканструкцыі абраду (ці яго асобнага этапу) на дакументальнай аснове і падсумоўваюцца вынікі практычнага ўвасаблення дыпломнай работы:

– указваецца палявы фальклорна-этнаграфічны і этнафанічны матэрыял (сабраны аўтарам дыпломнай работы і/ці апублікаваны ў працах асобных даследчыкаў ці аўтарскіх калектываў), які выкарыстоўваўся ў мастацкай рэканструкцыі;

– абгрунтоўваецца выбар спеўнага, рэчытатыўнага, музычнага, гульнявога і харэаграфічнага матэрыялу мастацкай рэканструкцыі;

– даецца этнафанічная характарыстыка абрадавых песень;

– прыводзіцца апісанне асноўных этапаў мастацкай рэканструкцыі: даследчы, сцэнарна-праектны, вучэбна-рэпетыцыйны, прэзентацыйны, аналітычны і інш.

**Заключэнне**. У гэтай частцы дыпломнай работы прыводзяцца асноўныя вынікі і зробленыя на іх аснове вывады. Заключэнне можа ўключаць 3–5 коратка сфармуляваных абагульненняў.

**Бібліяграфічны спіс.** Уключае ўсе выданні, якімі карыстаўся аўтар пры распрацоўцы тэмы. Пры наяўнасці ў сту-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэнта публікацый па праблеме, яны таксама ўключаюцца ў спіс. Аб'ём і якасць выкарыстанай літаратуры паказвае наколькі аўтар дыпломнай работы валодае інфармацыяй. Бібліяграфічны спіс літаратуры складаецца ў алфавітным парадку ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі: ГОСТ 7.1-2003 Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне, ГОСТ 7.82-2001 Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных рэсурсаў (Дадатак Е).

**Дадаткі.** Уяўляюць сабой матэрыял, які студэнт засвоіў у працэсе распрацоўкі тэмы, але самастойнага значэння не мае і таму прыводзіцца асобна, па-за тэкстам. Формы дадаткаў разнастайныя. Разам з традыцыйнымі формамі (ілюстрацыі, схемы, табліцы, ксеракопіі, копіі архіўных ці рэдкіх дакументаў) да тэксту дыпломнай работы могуць прыкладацца аўдыя- і відэаматэрыялы, электронныя версіі змястоўных тэкстаў і інш.

Дадаткі да тэксту дыпломнай работы студэнтаў *спецыяльнасці «рэжысура свят»* уключаюць:

– генеральны план дэкарыравання свята;

– карту-схему або план-размяшчэнне зон дзеяння;

– эскізы мастацкага афармлення сцэнічных пляцовак, святочных зон дзеяння, касцюмаў персанажаў, бутафорыі і рэквізіту, друкаванай прадукцыі (афіша і плакат, запрашальны білет, буклет і інш.);

– схемы вузлавых мізансцэн;

– службовую дакументацыю;

– фотаздымкі перыяду падрыхтоўкі і правядзення свята;

– мультымедыйную прэзентацыю (дыск з відэазапісам свята);

– пратакол прыёму дыпломнай работы (Дадатак Д).

Дадаткі да дыпломнай работы студэнтаў *спецыяльнасці «харэаграфічнае мастацтва»* ўключаюць эскізы касцюмаў, мастацкага афармлення нумара, праект (макет) афішы, праграмак, запрашальнага білета, фотаздымкі асобных эпізодаў нумара, дыск з відэазапісам нумара і іншыя дакументы.

У дадатках да тэксту дыпломнай работы студэнтаў *спецыяльнасці «народная творчасць», напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (тэатральная)»* прыводзяцца эскізы касцюмаў, мастацкага афармлення спектакля, праект (макет) афішы, праграмак, запрашальнага білета, фотаздымкі сцэн у рэпетыцыйны перыяд і падчас пастаноўкі спектакля, дыск з відэазапісам (па магчымасці) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да дыпломнай работы абавязкова дадаецца пратакол прыёму дыпломнай работы (Дадатак Д).

Дыпломная работа студэнтаў спецыяльнасці *«народная творчасць», напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (народныя рамёствы)»; спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамку спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)»* абавязкова ўключае дадаткі, у якіх ілюстрацыйны рад (фотаздымкі, малюнкі, эскізы) суправаджае тэкставую частку.

Адным з дадаткаў да дыпломнай работы выпускнікоў спецыяльнасці *«дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамку спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)»* з'яўляецца распрацаваны студэнтам рэстаўрацыйны пашпарт твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама постар або мультымедыйная прэзентацыя этапаў рэстаўрацыйных работ.

Дадаткі да дыпломнай работы студэнтаў *спецыяльнасці «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», спецыялізацыя «этнафоназнаўства»* ілюструюць асноўныя палажэнні ўвасобленай мастацкай рэканструкцыі абраду (ці яго асобнага этапу) на дакументальнай аснове. Дадаткамі з'яўляюцца: рэпертуарны зборнік (у друкаваным выглядзе і на аўдыяносьбіце), абрадавая карта, сцэнарны план, відэаматэрыял правядзення дыпломнага праекта ці інш.

Не ўваходзяць у склад дыпломнай работы, але з'яўляюцца абавязковымі суправаджальнымі дакументамі: заданне на дыпломную работу, водзыў навуковага кіраўніка і рэцэнзія на дыпломную работу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Падрыхтоўка практычнай часткі дыпломнай работы

Работа над практычнай часткай дыпломнай работы вядзецца студэнтам, як правіла, падчас пераддыпломнай практыкі.

*Спецыяльнасць «рэжысура свят».* У перыяд працы над практычнай часткай дыпломнай работы студэнт павінен:

– распрацаваць разгорнуты сцэнарны план і літаратурны сцэнарый свята;

– вызначыць ідэйна-тэматычны аналіз, кампазіцыйную пабудову, сцэнарна-рэжысёрскі ход і мастацкі вобраз свята;

– распрацаваць сумесна з мастаком-пастаноўшчыкам – мастацка-дэкаратыўнае, з харэографам-пастаноўшчыкам – пластыка-харэаграфічнае, з музычным кіраўніком – музычна-шумавое вырашэнне свята;

– падрыхтаваць пастановачны план, графік рэпетыцый, каштарыс;

– арганізаваць рэпетыцыйны працэс з удзельнікамі свята;

– ажыццявіць пастаноўку свята.

Калі свята вялікае па маштабе дзеяння або поліфанічнай накіраванасці (г. зн. адначасовае функцыянаванне некалькіх зон дзеяння, кожная з якіх мае сваю ідэйна-тэматычную накіраванасць, структуру, кампазіцыйную пабудову і вобразнае рашэнне), то над такім святам дазваляецца працаваць двум або некалькім студэнтам.

*Спецыяльнасць «харэаграфічнае мастацтва».* Пры выкананні практычнай часткі дыпломнай работы студэнт павінен самастойна падрыхтаваць харэаграфічны твор.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (тэатральная)».* У перыяд працы над практычнай часткай дыпломнай работы студэнт павінен:

– здзейсніць сцэнічнае ўвасабленне спектакля па творах замежных або айчынных аўтараў;

– падрыхтаваць рэжысёрскі пастановачны план спектакля;

– скласці графік рэпетыцый;

– арганізаваць рэпетыцыйны працэс;

– стварыць эскізы запрашальных квіткоў, афішы, касцюмаў, бутафорыі, дэкарацыйнага афармлення і інш.;

– распрацаваць музычна-шумавую партытуру спектакля;

– зрабіць фотаздымкі і відэазапіс эпізодаў рэпетыцый і спектакля.

У выпадку, калі студэнт-выпускнік кафедры тэатральнай творчасці працуе ў прафесійным тэатры, ён прадстаўляе выпіску з пратакола пасяджэння мастацкага савета тэатра з абмеркаваннем дыпломнага спектакля.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (народныя рамёствы)»; спецыяльнасць «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамак спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)».* Мэтай практычнай часткі з'яўляецца візуалізацыя мастацкай ідэі праз арыгінальны пластычны вобраз у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўным матэрыяле і тэхніцы (кераміка, ткацтва, габелен, батык, саломапляценне, роспіс, выцінанка, лямец); узбагачэнне традыцыйных канструктыўна-пластычных прыёмаў народнага рамяства, выкарыстанне дасягненняў сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Завершаны мастацкі твор прадстаўляе сабой дэкаратыўнае пано (серыю, дыптых, трыпціх) або аб'ёмныя формы, якія складаюць ансамбль прадметаў і павінен адлюстроўваць разуменне выпускніком спецыфікі формаўтварэння вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; пластычных уласцівасцей матэрыялу; сувязі дэкору з формай і матэрыялам; функцыі колеру ў творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Практычная частка дыпломнай работы студэнтаў спецыяльнасці *«дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», напрамку спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)»* звязана з матэрыялам, тэхналагічнымі асаблівасцямі і непасрэдна творам, які быў рэстаўрыраваны студэнтам. Завершаная работа афармляецца як выставачны твор (на падрамніках, у рамах, на планках і інш.) з улікам асаблівасцей экспанавання.

Неад'емнай часткай дыпломнай работы з'яўляецца выкананне планшэта, на якім мастацка-вобразная ідэя ўвасабляецца лаканічна, выразнымі графічнымі прыёмамі.

Дыпломная работа выконваецца выпускніком поўнасцю або часткова з уласных матэрыялаў і за ўласныя сродкі. На абарону абавязкова прадстаўляюцца ўсе часткі дыпломнай работы.

*Спецыяльнасць «народная творчасць», напрамак спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», спецыялізацыя «этнафоназнаўства».* Пры падрыхтоўцы практычнай часткі дыпломнай работы студэнт павінен:

– зафіксаваць на відэа выбраную для мастацкай рэканструкцыі абрадавую з'яву ў жывым бытаванні (калі ступень яе захаванасці дазваляе гэта зрабіць);

– на аснове тэарэтычных ведаў і эмпірычнага матэрыялу стварыць абрадавую карту, рэпертуарны зборнік і сцэнарны план мастацкай рэканструкцыі;

– ажыццявіць паслядоўна галоўныя этапы мастацкай рэканструкцыі і зафіксаваць на відэа яе ўвасабленне;

– правесці аналіз выканання дыпломнага праекта і афарміць дадаткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Патрабаванні да афармлення дыпломнай работы

Мова напісання дыпломнай работы – руская ці беларуская. Аб’ём дыпломнай работы (без бібліяграфічнага спіса і дадаткаў) не менш 50 старонак камп’ютарнага тэксту.

Тэкст дыпломнай работы друкуецца на адным баку аркуша белай паперы фармату А4 (210х297 мм) з выкарыстаннем тэкставага рэдактара Word, шрыфт Times New Roman памерам 14 пунктаў, міжрадковы інтэрвал – 18 пунктаў, выраўноўванне тэксту па шырыне аркуша. Палі: левае – 3 см, правае – 1 см, верхняе і ніжняе – 2 см.

Шрыфт павінен быць прамым, выразным, чорнага колеру. Дазваляецца выкарыстоўваць камп’ютарныя магчымасці для акцэнтавання ўвагі на асобных словах, тэрмінах, выразах – ужываць курсіўнае, паўтлустае напісанне, падкрэсліванне і г. д.

Дыпломная работа павінна мець агульную нумарацыю старонак (уключаючы бібліяграфічны спіс і дадаткі). Першай старонкай з’яўляецца тытульны ліст, на якім нумар старонкі не ставіцца, другой – рэферат, з якога і пачынаецца нумарацыя старонак. Нумарацыя старонак ставіцца арабскімі лічбамі ў цэнтры верхняй часткі старонкі.

Асаблівай увагі і афармлення патрабуюць структурныя часткі дыпломнай работы: тытульны ліст, рэферат, змест, уводзіны, главы, раздзелы і падраздзелы, заключэнне, бібліяграфічны спіс, дадаткі.

Загалоўкі структурных частак дыпломнай работы РЭФЕРАТ, ЗМЕСТ, УВОДЗІНЫ, ГЛАВА, ЗАКЛЮЧЭННЕ, БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС, ДАДАТКІ друкуюць вялікімі літарамі ў сярэдзіне радка тлустым шрыфтам памерам 16 пунктаў. Кожная структурная частка пачынаецца з новай старонкі. Загалоўкі структурных частак дыпломнай работы «Рэферат», «Змест», «Уводзіны», «Заключэнне», «Бібліяграфічны спіс», «Дадаткі» не нумаруюцца.

Тэкст асноўнай часткі дыпломных работ падзяляецца на главы, раздзелы, падраздзелы і (калі патрэбна) пункты, якія маюць загалоўкі. Пункт можа не мець загалоўка.

Главы, раздзелы, падраздзелы, пункты нумаруюцца арабскімі лічбамі без знака №. Нумар главы ставіцца пасля слова «Глава» без кропкі пасля лічбы. Раздзелы нумаруюцца ў межах кожнай главы. Нумар раздзела ўключае нумар главы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадкавы нумар раздзела, якія раздзелены кропкай. Напрыклад, 1.3 – трэці раздзел першай главы.

Падраздзелы нумаруюцца ў межах кожнага раздзела. Нумар падраздзела ўключае парадкавыя нумары главы, раздзела, падраздзела, падзеленыя кропкамі. Напрыклад, 1.3.2 – другі падраздзел трэцяга раздзела першай главы.

Пункты нумаруюцца арабскімі лічбамі ў межах кожнага падраздзела. Нумар пункта ўключае парадкавыя нумары главы, раздзела, падраздзела, пункта, падзеленыя кропкамі. Напрыклад, 1.2.3.1 – першы пункт трэцяга падраздзела другога раздзела першай главы.

Загаловак главы друкуецца з новага радка, які ідзе пасля нумара главы, вялікімі літарамі тлустым шрыфтам памерам 16 пунктаў. Загалоўкі раздзелаў, падраздзелаў друкуюцца пасля іх нумара праз прабел малымі літарамі (акрамя першай вялікай) тлустым шрыфтам памерам 16 пунктаў. Загалоўкі пунктаў друкуюць пасля іх нумара праз прабел малымі літарамі (акрамя першай вялікай) тлустым шрыфтам памерам 14 пунктаў.

У канцы загалоўкаў глаў, раздзелаў і падраздзелаў кропку не ставяць. Калі загаловак складаецца з двух ці болей сказаў, іх раздзяляюць кропкай (кропкамі), апошні сказ – без кропкі. У канцы загалоўка пункта ставяць кропку.

Адлегласць паміж загалоўкам (за выключэннем загалоўка пункта) і тэкстам павінна складаць 2 міжрадковыя інтэрвалы.

Вельмі важна звярнуць увагу на афармленне спасылак на крыніцы. Любы тэкст прамога цытавання бярэцца ў двукоссе “ ”, пасля чаго даецца спасылка ў квадратных дужках [ ], унутры якіх ставяцца дзве лічбы: першая азначае нумар крыніцы цытавання з бібліяграфічнага спіса, а другая – нумар старонкі [5, с. 87]. Пры не дакладным, але блізкім да арыгінала перказе таксама даецца спасылка.

Дадаткі размяшчаюцца ў канцы дыпломнай работы пасля бібліяграфічнага спіса. Усім дадаткам павінна папярэднічаць старонка, на якой зафіксавана назва структурнай часткі дыплома – ДАДАТКІ. Кожны дадатак пачынаецца з новай старонкі. У правым верхнім куце вялікімі літарамі пішацца слова ДАДАТАК. Дадаткі пазначаюць вялікімі літарамі кірылічнага алфавіта, пачынаючы з літары А (за выключэннем літар Ё, З, Й, О, Ч, Ь, Ы, Ъ), напрыклад: ДАДАТАК А, ДАДАТАК Б. Назва дадатку, у якой раскрываецца яго змест, пішацца ў цэнтры старонкі з вялікай літары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах кожнага дадатку ілюстрацыі, фотаздымкі, малюнкі, табліцы, схемы і г.д. нумаруюцца (напрыклад, Малюнак 3) і падпісваюцца.

Ілюстрацыі, фотаздымкі, малюнкі, табліцы, схемы і г. д. могуць размяшчацца непасрэдна ў тэксце пасля таго абзаца, у якім яны ўзгадваюцца ўпершыню. У гэтым выпадку іх нумар складацца з нумара раздзела і парадкавага нумара ілюстрацыі, малюнка ці табліцы. Напрыклад, Малюнак 1.3 – трэці малюнак першай главы. Назва пішацца пасля нумара і аддзяляецца ад яго працяжнікам. Напрыклад, Малюнак 1.3 – нумар і назва размяшчаюцца пасля малюнка, табліцы, фотаздымка і г. д. і друкуюцца па цэнтры малымі літарамі (акрамя першай вялікай) паўтлустым шрыфтам памерам 14 пунктаў, кропку ў канцы не ставяць.

На ўсе малюнкі, табліцы, фотаздымкі і г. д. павінны быць спасылкі ў тэксце дыпломнай работы, напрыклад (Дадатак А, мал. 3).

Пасля камп'ютарнага набору неабходна ўважліва вычытаць тэкст і выправіць граматычныя і тэхнічныя памылкі. Дыпломная работа з памылкамі не прымаецца і вяртаецца на дапрацоўку.

Тэкст рукапісу, які набраны на камп'ютары згодна патрабаванням, з бібліяграфічным спісам і дадаткамі пераплятаецца ў папку. Афармленне вокладкі, акуратнасць пераплёту, якасць паперы і папкі – усё гэта не толькі раскрывае знешні выгляд дыплома, але і характарызуе студэнта, які імкнецца прадставіць сваю работу да абароны.

## Абарона дыпломнай работы

Абарона дыпломнай работы адбываецца на адкрытым пасяджэнні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, на якім могуць прысутнічаць навуковыя кіраўнікі і рэцэнзенты. Працэдура абароны пачынаецца з даклада выпускніка, у якім ён раскрывае змест сваёй працы. Падчас даклада выпускнік можа выкарыстоўваць (па рашэнні кафедры) інфармацыйныя тэхналогіі. Затым выступаюць навуковы кіраўнік, рэцэнзент (або зачытваюцца водзыў і рэцэнзія на дыпломную работу), задаюцца пытанні членамі дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтару-студэнту даецца слова для адказаў на пытанні і заўвагі рэцэнзента.

Пасля таго як абароняцца ўсе студэнты групы, камісія абмяркоўвае і абвяшчае вынікі. Вынікі абароны агучваюцца старшынёй ДЭК.

Дыпломныя работы захоўваюцца на кафедры разам з электронным носьбітам, водзывам навуковага кіраўніка і рэцэнзіяй на працягу пяці год.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

ДАДАТАК А

**Узор афармлення задання на дыпломную работу**

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Кафедра ______________________________________________
(найменаванне кафедры)

Зацвярджаю
Загадчык кафедры ______ ____________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

Дата

**Заданне на дыпломную работу**

Студэнту ______________________________________________
(прозвішча, ініцыялы)

1. Тэма дыпломнай работы ______________________________
_______________________________________________________

Зацверджана загадам рэктара БДУКМ ад ____________ № ___________

2. Зыходныя даныя да дыпломнай работы ____________________
_______________________________________________________
_______________________________________________________
_______________________________________________________

3. Пералік пытанняў, якія будуць распрацаваны:
а)_____________________________________________________
б)_____________________________________________________
і г. д.__________________________________________________

4. Кансультанты па дыпломнай рабоце з указаннем раздзелаў_________
_______________________________________________________

5. Прыкладны каляндарны графік выканання дыпломнай работы _____
_______________________________________________________

6. Дата выдачы задання __________________________________

7. Тэрмін здачы дыпломнай работы___________________________

Кіраўнік _________________ ________________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

Подпіс студэнта ______________
Дата

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДАДАТАК Б

**Узор афармлення тытульнага ліста дыпломнай работы**

**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва
Кафедра тэатральнай творчасці

Дапушчана да абароны:
Загадчык кафедры
___________ Р.Л. Бузук
«___» _________ 20__ г.

**РЭЖЫСЁРСКІ ПАСТАНОВАЧНЫ ПЛАН СПЕКТАКЛЯ «СЁСТРЫ ПСІХЕІ» ПАВОДЛЕ П'ЕСЫ С.КАВАЛЁВА**

ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА

Спецыяльнасць Народная творчасць
Напрамак спецыяльнасці Народная творчасць (тэатральная)

**Выканаў**
студэнт 5 курса 515 групы
Юрэвіч Аляксей Віктаравіч

**Навуковы кіраўнік**
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт
Голікава Ларыса Фёдараўна

Мінск, 20_

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДАДАТАК В

**Узор афармлення зместу дыпломнай работы**

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ …………………………………………………………………... 4

ГЛАВА 1 АНАЛІЗ НАВУКОВЫХ КРЫНІЦ ПА ТЭМЕ ДАСЛЕДАВАННЯ ………………………………………………………………….. 6

1.1 Традыцыйная культура Гродзеншчыны ў працах этнографаў і фалькларыстаў ХІХ – пачатку ХХ ст. ……..…………………………… 6

1.2 Сучасныя даследаванні абрадавага і песеннага фальклору Панямоння ……………………………………………………………………. 12

ГЛАВА 2 МІФАСЕМАНТЫКА І ЭТНАФОНІЯ АБРАДУ ЮР'Я ….. 18

2.1 Генезіс і структура юраўскай абраднасці ………………………… 18

2.2 Этнафанічныя характарыстыкі спеўнай традыцыі абраду Юр'я … 25

ГЛАВА 3 РЭКАНСТРУКЦЫЯ АБРАДУ ЮР'Я ВЁСКІ АХОНАВА ДЗЯТЛАЎСКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ …………... 33

3.1 Тэарэтычныя асновы рэканструкцыі ……………………………… 33

3.2 Этапы практычнага ўвасаблення рэканструкцыі ………………… 40

ЗАКЛЮЧЭННЕ ……………………………………………………… 48

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС ……………………………………………… 51

ДАДАТКІ ………………………………………………………………….. 54


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДАДАТАК Г

## Прыкладны пералік пытанняў для работы над рэжысёрскім пастановачным планам (эксплікацыяй) дыпломнага спектакля

### ГЛАВА I ДАСЛЕДАВАННІ АБ АЎТАРЫ

1. Асноўныя этапы жыццёвага шляху аўтара
2. Асноўныя этапы творчага шляху аўтара
3. Кароткі аналіз творчасці драматурга (пісьменніка, паэта)
4. Літаратурна-мастацкія і стылістычныя асаблівасці творчасці драматурга (пісьменніка, паэта)
5. Асноўныя тэма і ідэя творчасці драматурга (пісьменніка, паэта)
6. Роля і месца дадзенага твора ў творчасці драматурга (пісьменніка, паэта)
7. Стылістычныя і моўныя асаблівасці абранага твора (п’есы, апавядання, аповесці, верша)
8. Гісторыя пастановак абранага твора на сцэне

### ГЛАВА II РЭЖЫСЁРСКІ АНАЛІЗ ТВОРА (П’ЕСЫ, ПРОЗЫ, ВЕРША)

9. Першыя ўражанні аб творы
10. Тэма і ідэя твора
11. Сюжэт і фабула твора
12. Жанр і стыль твора
13. Прапанаваныя абставіны твора
14. Скразное і контрскразное дзеянне ў творы, іх носьбіты
15. Асноўны і другарадныя канфлікты ў творы, іх носьбіты
16. Кампазіцыйная пабудова твора
17. Асноўныя аўтарскія рэмаркі ў творы
18. Характарыстыка дзеючых асоб, дадзеная аўтарам твора

### ГЛАВА III РЭЖЫСЁРСКАЯ ЗАДУМА (ЭКСПЛІКАЦЫЯ) ДЫПЛОМНАГА СПЕКТАКЛЯ

19. Тэма, ідэя і звышзадача спектакля
20. Жанр спектакля
21. Стыль спектакля
22. Прапанаваныя абставіны спектакля
23. Кампазіцыйная пабудова спектакля
24. Падзейны рад спектакля і яго ключавыя мізансцэны
25. Характарыстыка дзеючых асоб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

26. Прынцыпы сцэнаграфічна-дэкарацыйнага вырашэння
27. Прынцыпы музычна-шумавога вырашэння

**ГЛАВА IV УВАСАБЛЕННЕ РЭЖЫСЁРСКАЙ ЗАДУМЫ ДЫПЛОМНАГА СПЕКТАКЛЯ**

28. Сцэнаграфія спектакля
29. Музычна-шумавая партытура спектакля
30. Светлавое вырашэнне спектакля
31. Пластыка-харэаграфічнае вырашэнне спектакля
32. Атмасфера спектакля
33. Прэм'ерны паказ спектакля
34. Фотаздымкі сцэн падчас рэпетыцый і прэм'еры спектакля
35. Відэазапіс спектакля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДАДАТАК Д

## Узор пратакола прыёму дыпломнай работы

### Пратакол
### прыёму дыпломнай работы

Студэнт (ка) ______________________________________________________
групы ______ кафедры _______________________________________________
факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва (факультэта завочнага навучання) УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
У перыяд з __________ 20____ г. па __________20____ г.
падрыхтаваў (ла) (у) ______________________________________________
(указаць поўнае найменаванне арганізацыі, калектыву або ўстановы, адрас)
____________________________________________________________________
прадставіў (ла) ____________________________________________________
(указаць назву дыпломнай работы)
____________________________________________________________________

Камісія абмеркавала дыпломную работу і адзначыла: _______________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________
Камісія прымае дыпломную работу з адзнакай (па дзесяцібальнай сістэме) ___________________

Старшыня камісіі__________________ ____________________________
____________________________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, месца работы і подпіс )

Члены камісіі: (прозвішча, імя, імя па бацьку, подпіс)
1. __________________________________________________________________
2. __________________________________________________________________
3. __________________________________________________________________

______________________________
М.П.
«____» ______________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Узор афармлення бібліяграфічнага апісання ў бібліяграфічным спісе, які змяшчаецца ў дыпломнай рабоце**

Прыклады апісання самастойных выданняў

| Характарыстыка крыніцы | Прыклад афармлення |
|---|---|
| Адзін, два ці тры аўтары | Котаў, А.Л. Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя / А.І. Котаў. – 2-е выд. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 168 с. |
| Чатыры і болей аўтараў | Культурология: учеб. пособие для вузов / С.В. Лапина [и др.]; под общ. ред. С.В. Лапиной. – 2-е изд. – Минск: ТетраСистемс, 2004. – 495 с. |
| Калектыўны аўтар | Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Нац. комис. по устойчивому развитию Респ. Беларусь; редкол.: Л.М. Александрович [и др.]. – Минск: Юнипак, 2004. – 202 с. |
| Мнагатомнае выданне | Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – 6 т. |
| Асобны том у мнагатомным выданні | Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 343 с. |
| Законы і заканадаўчыя матэрыялы | Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2005. – 48 с. |
| Зборнік артыкулаў, прац | Информационное обеспечение науки Беларуси: к 80-летию со дня основания ЦНБ им. Я.Коласа НАН Беларуси: сб. науч. ст. / НАН Беларуси, Центр. науч. б-ка; редкол.: Н.Ю. Березкина (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2004. – 174 с. |
| Зборнікі без агульнай назвы | Певзнер, Н. Английское в английском искусстве / Н. Певзнер; пер. О.Р. Демидовой. Идеологические источники радиатора «роллс-ройса» / Э. Панофский; пер. Л.Н. Житковой. – СПб.: Азбука-классика, 2004. – 318 с. |
| Матэрыялы канферэнцый | Правовая система Республики Беларусь: состояние, проблемы, перспективы развития: материалы V межвуз. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Гродно, 21 апр. 2005 г. / Гродн. гос. ун-т; редкол.: О.Н. Толочко (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2005. – 239 с. |
| Інструкцыя | Инструкция о порядке совершения операций с банковскими пластиковыми карточками: утв. Правлением Нац. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | банка Респ. Беларусь 30.04.04: текст по состоянию на 1 дек. 2004 г. – Минск: Дикта, 2004. – 23 с. |
| Вучэбна-метадычныя матэрыялы | Философия и методология науки: учеб.-метод. комплекс для магистратуры / А.И. Зеленков [и др.]; под ред. А.И. Зеленкова.– Минск: Изд-во БГУ, 2004. – 108 с. |
| Інфармацыйныя выданні | Реклама на рубеже тысячелетий: ретросп. библиогр. указ. (1998–2003) / М-во образования и науки Рос. Федерации, Гос. публич. науч.-техн. б-ка России; сост.: В.В. Климова, О.М. Мещеркина. – М., 2004. – 288 с. |
| Каталог | Памятные и инвестиционные монеты России из драгоценных металлов, 1921–2003: каталог-справочник / ред.-сост. Л.М. Пряжникова. – М.: ИнтерКрим-пресс, 2004. – 462 с. |
| Аўтарскае пасведчанне | Инерциальный волнограф: а. с. 1696865 СССР, МКИ5 G 01 C 13/00 / Ю.В. Дубинский, Н.Ю. Мордашова, А.В. Ференц; Казан. авиац. ин-т. – № 4497433; заявл. 24.10.88; опубл. 07.12.91 // Открытия. Изобрет. – 1991. – № 45. – С. 28. |
| Патэнт | Способ получения сульфокатионита: пат. 6210 Респ. Беларусь, МПК7 C 08 J 5/20, C 08 G 2/30 / Л.М. Ляхнович, С.В. Покровская, И.В. Волкова, С.М. Ткачев; заявитель Полоц. гос. ун-т. – № а 0000011; заявл. 04.01.00; опубл. 30.06.04 // Афіцыйны бюл. / Нац. цэнтр інтэлектуал. уласнасці. – 2004. – № 2. – С. 174. |
| Стандарт | Безопасность оборудования. Термины и определения: ГОСТ ЕН 1070–2003. – Введ. 01.09.04. – Минск: Межгос. совет по стандартизации, метрологии и сертификации: Белорус. гос. ин-т стандартизации и сертификации, 2004. – 21 с. |
| Справаздача аб НДР | Комплексное (хирургическое) лечение послеоперационных и рецидивных вентральных грыж больших и огромных размеров: отчет о НИР / Гродн. гос. мед. ин-т; рук. В.М. Колтонюк. – Гродно, 1994. – 42 с. – № ГР 1993310. |
| Аўтарэферат дысертацыі | Шакун, Н.С. Кірыла-Мяфодзіеўская традыцыя на Тураўшчыне: (да праблемы лакальных тыпаў старажытнаславянскай мовы): аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.03 / Н.С. Шакун; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2005. – 16 с. |
| Дысертацыя | Лук'янюк, Ю.М. Сучасная беларуская філасофская тэрміналогія: (семантычныя і структурныя аспекты): дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.01 / Ю.М. Лук'янюк. – Мінск, 2003. – 129 л. |
| Дэпаніраваныя навуковыя працы | Влияние деформации и больших световых потоков на люминесценцию монокристаллов сульфида цинка с микропорами / В.Г. Клюев [и др.]; Воронеж. ун-т. – Воронеж, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | 1993. – 14 с. – Деп. в ВИНИТИ 10.06.93, № 1620-В93 // Журн. приклад. спектроскопии. – 1993. – Т. 59, № 3–4. – С. 368. |
| Архіўныя матэрыялы | 1. Архив Гродненского областного суда за 1992 г. – Дело № 4/8117. 2. Архив суда Центрального района г. Могилева за 2001 г. – Уголовное дело № 2/1577. |
| Электронныя рэсурсы | Театр [Электронный ресурс]: энциклопедия: по материалам изд-ва «Большая российская энциклопедия»: в 3 т. – Электрон. дан. (486 Мб). – М.: Кордис & Медиа, 2003. – Электрон. опт. диски (CD-ROM): зв., цв. – Т. 1: Балет. – 1 диск; Т. 2: Опера. – 1 диск; Т. 3: Драма. – 1 диск. |
| Рэсурсы аддаленага доступу | Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 25.01.2006. |
| | Proceeding of mini-symposium on biological nomenclature in the 21st centry [Electronic resource] / Ed. J.L. Reveal. – College Park M.D., 1996. – Mode of access: http://www.mform.md.edu/PBIO/ brum.html. – Date of access: 14.09.2005. |

Прыклады апісання састаўных частак выданняў

| Характарыстыка крыніцы | Прыклад афармлення |
|---|---|
| Састаўная частка кнігі | Михнюк, Т.Ф. Правовые и организационные вопросы охраны труда / Т.Ф. Михнюк // Безопасность жизнедеятельности: учеб. пособие / Т.Ф. Михнюк. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск, 2004. – С. 90–101. |
| Састаўная частка зборніка | Якіменка, Т.С. Аб песенна-эпічнай традыцыі ў музычным фальклоры беларусаў / Т.С. Якіменка // Беларуская музыка: гісторыя і традыцыі: зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. акад. музыкі; склад. і навук. рэд. В.А. Антаневіч. – Мінск, 2003. – С. 47–74. |
| Глава з кнігі | Бунакова, В.А. Формирование русской духовной культуры / В.А. Бунакова // Отечественная история: учеб. пособие / С.Н. Полторак [и др.]; под ред. Р.В. Дегтяревой, С.Н. Полторака. – М., 2004. – Гл. 6. – С. 112–125. |
| Частка са збору твораў, выбраных твораў | Гілевіч, Н. Сон у бяссоніцу / Н. Гілевіч // Зб. тв.: у 23 т. – Мінск, 2003. – Т. 6. – С. 382–383. |
| Артыкулы з тэзісаў дакладаў і матэрыялаў канферэнцый | Ермакова, Л.Л. Полесский каравайный обряд в пространстве культуры / Л.Л. Ермакова // Тураўскія чытанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Гомель, 4 верас. 2004 г. / НАН Беларусі, Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: У.І. Коваль [і інш.]. – Гомель, 2005. – С. 173–178. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Артыкул з бягучага выдання | Ипатьев, А.В. К вопросу о разработке средств защиты населения в случае возникновения глобальных природных пожаров / А.В. Ипатьев, А.В. Василевич // Сб. науч. тр. / Ин-т леса НАН Беларуси. – Гомель, 2004. – Вып. 60: Проблемы лесоведения и лесоводства на радиоактивно загрязненных землях. – С. 233–238. |
| Артыкул з часопіса | Масляніцына, І. Жанчыны ў гісторыі Беларусі / І. Масляніцына, М. Багадзяж // Беларус. гіст. часоп. – 2005. – № 4. – С. 49–53. |
| Артыкул з газеты | Ушкоў, Я. З гісторыі лімаўскай крытыкі / Я. Ушкоў // ЛіМ. – 2005. – 5 жн. – С. 7. |
| Артыкул з энцыклапедыі, слоўніка | Дарашэвіч, Э.К. / Э.К. Дарашэвіч, І. І. Храптовіч // Мыслiцелі і асветнікі Беларусі (X–XIX стагоддзі): энцыкл. давед. / склад. Г.А. Маслыка; гал. рэд. Б.І. Сачанка. – Мінск, 1995. – С 326–328. |
| Рэцэнзіі | Пазнякоў, В. Крыху пра нашыя нацыянальныя рысы / В. Пазнякоў // Arche = Пачатак. – 2001. – № 4. – С. 78–84. – Рэц. на кн.: Лакотка, А. І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / А.І. Лакотка. – Мінск: Ураджай, 1999. – 366 с. |
| Законы і заканадаўчыя матэрыялы | Об утверждении важнейших параметров прогноза социально-экономического развития Республики Беларусь на 2006 год: Указ Президента Респ. Беларусь, 12 дек. 2005 г., № 587 // Эталон – Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006. |
| Архіўныя матэрыялы | Описание синагоги в г. Минске (план части здания синагоги 1896 г.) // Центральный исторический архив Москвы (ЦИАМ). – Фонд 454. – Оп. 3. – Д. 21. – Л. 18–19. |
| Састаўная частка CD-ROMa | Введенский, Л.И. Судьбы философии в России / Л.И. Введенский // История философии [Электронный ресурс]: собрание трудов крупнейших философов по истории философии. – Электрон. дан. и прогр. (196 Мб). – М., 2002. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM): зв., цв. |
| Рэсурсы аддаленага доступу | Козулько, Г. Беловежская пуща должна стать мировым наследием / Г. Козулько // Беловежская пуща – XXI век [Электронный ресурс]. – 2004. – Режим доступа: http://bp21.org.by/ru/art/ a041031. html. – Дата доступа: 02.02.2006. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ**
**ПА ВЫКАНАННІ ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ**

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,86. Ул.-выд. арк. 1,29. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ